# ПАЛАЖЭННЕ
## аб правядзенні рэспубліканскага конкурсу літаратурных крыжаванак “Нельга забыць: вайна ў творах беларускіх пісьменнікаў”, прысвечанага 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, сярод дзяцей і моладзі

### 1. Агульныя палажэнні

1.1. Сапраўднае Палажэнне аб правядзенні рэспубліканскага конкурсу літаратурных крыжаванак “Нельга забыць: вайна ў творах беларускіх пісьменнікаў”, прысвечанага 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, сярод дзяцей і моладзі (далей – Конкурс) вызначае мэты і задачы, умовы і парадак правядзення Конкурсу, патрабаванні да зместу і афармлення работ, крытэрыі ацэньвання, парадак узнагароджання ўдзельнікаў Конкурсу.

1.2. Арганізатарамі Конкурсу з'яўляецца: установа “Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры”, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова “КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА”, Грамадскае аб’яднанне “Саюз пісьменнікаў Беларусі” (далей – Арганізацыйны камітэт).

1.3. Сапраўднае Палажэнне можа быць зменена і дапоўнена па ініцыятыве арганізатараў Конкурсу.

### 2. Мэты і задачы Конкурсу

2.1. Конкурс праводзіцца ў мэтах:

выхавання пачуцця патрыятызму, павагі і гонару за гістарычнае мінулае нашай Радзімы, гераічны подзвіг беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны;

папулярызацыі і захавання літаратурнай спадчыны беларускіх пісьменнікаў – удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны.

2.2. Задачы Конкурсу:

фарміраванне цікавасці да гістарычнай праўды гераічнага ваеннага мінулага нашай краіны;

садзейнічанне развіццю інтэлектуальна-творчага патэнцыялу дзяцей і моладзі;

актывізацыя пазнавальнай дзейнасці і творчай актыўнасці падрастаючага пакалення.

### 3. Удзельнікі Конкурсу

3.1. У Конкурсе прымаюць удзел дзеці і моладзь у наступных узроставых катэгорыях: 10 – 12 гадоў, 13-15 гадоў, 16 – 18 гадоў.

### 4. Патрабаванні да матэрыялаў

4.1. афармленне на беларускай мове па агульнапрынятых правілах складання крыжаванак;

4.2. словы (адказы) павінны быць назоўнікамі ў назоўным склоне адзіночнага ліку (выключэнне складаюць толькі словы, якія не маюць адзіночнага ліку, напрыклад, “акуляры”);

4.3. не дапускаецца ўключэнне ў крыжаванку паняццяў, якія складаюцца з 2-х і больш слоў, а таксама слоў, якія пішуцца праз злучок;

4.4. клеткі крыжаванкі, куды павінны ўпісвацца першыя літары слоў, паслядоўна нумаруюцца. Пад адным нумарам могуць ісці два словы (па гарызанталі і вертыкалі), калі яны пачынаюцца з агульнай літары;

4.5. сетка крыжаванкі павінна выглядаць суцэльным малюнкам або арнаментам, быць эстэтычна прывабнай;

4.6. дапускаецца як класічная, так і фігурная форма сеткі крыжаванкі;

4.7. аб'ём крыжаванкі павінен складаць не менш за 15 слоў;

4.8. сродкі для стварэння крыжаванкі могуць быць выбраны самастойна: тэкставыя рэдактары, графічныя рэдактары, электронныя табліцы, праграмы па стварэнні крыжаванак.

## 5. Крытэрыі ацэнкі конкурсных работ

5.1. адпаведнасць тэматыцы Конкурсу;

5.2. граматнасць і лаканічнасць у складанні пытанняў;

5.3. ступень складанасці крыжаванкі;

5.4. высокая якасць мастацкага выканання;

5.5. арыгінальнасць зместу крыжаванкі і дызайну афармлення;

5.6. літаратурная, эстэтычная выразнасць;

5.7. актуальнасць прадстаўленых матэрыялаў.

## 6. Тэрмін правядзення, умовы і парадак удзелу ў Конкурсе

6.1. Конкурс праводзіцца з 1 красавіка па 10 чэрвеня 2024 года.

6.2. Для ўдзелу ў Конкурсе неабходна прадставіць да 1 чэрвеня 2024 года ва ўстанову “Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры” заяўкі на ўдзел (Дадатак) разам з творчымі работамі на электронны адрас: bellitmuzej.proekty@gmail.com (з пазнакай “Крыжаванка”). Тэлефон для даведак: +375 (17) 395-44-47.

6.3. Падвядзенне вынікаў Конкурсу з 3 па 10 чэрвеня 2024 года.

6.4. Конкурсные работы павінны ўключаць:

незапоўненую крыжаванку і пытанні да яе ў электронным выглядзе;

запоўненую крыжаванку ў электронным выглядзе з адказамі.

6.5. Да ўдзелу ў Конкурсе допускаюцца прадстаўленыя ў тэрмін творчыя работы, змест якіх адпавядае патрабаванням паводле сапраўднага Палажэння.

6.6. Дзейнічае абмежаванне па колькасці работ, якія дасылаюцца на Конкурс. **Ад аднаго аўтара прымаецца 1 (адна) творчая заяўка.**

6.7. У Конкурсе ўдзельнічаюць творчыя работы нідзе раней не надрукаваныя.

6.8. Удзельнікі Конкурсу даюць сваю згоду на апрацоўку сваіх персанальных дадзеных: прозвішча, імя, імя па бацьку, узрост і іншых персанальных дадзеных.

6.9. Удзел у Конкурсе азначае згоду аўтара (аўтараў) на размяшчэнне творчых работ на web-ресурсах арганізатараў Конкурсу.

6.10. Работы, якія не адпавядаюць сапраўднаму Палажэнню, Арганізацыйным камітэтам не разглядаюцца.

## 7. Падвядзенне вынікаў і ўзнагароджанне

7.1. Па кожнаму з крытэрыяў ацэнкі конкурсных работ членамі Арганізацыйнага камітэту выстаўляецца бал ад 1 да 5. Пераможцам у Конкурсе лічыцца ўдзельнік, які атрымаў найбольшую колькасць балаў.

7.2. Па выніках Конкурсу вызначаюцца пераможцы, якія ўзнагароджваюцца дыпломамі і памятнымі падарункамі ўстановы “Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры”, памятнымі падарункамі грамадскага аб’яднання “Саюз пісьменнікаў Беларусі”. У кожнай узроставай групе прызначаецца па 3 прызавых месцы (I, II і III месца).

7.3. Урачыстае ўзнагароджанне пераможцаў адбудзецца 2 ліпеня 2024 года ва ўстанове “Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры” па адрасе: г. Мінск, вул. М.Багдановіча, 13, падчас правядзення святочнага мерапрыемства, прымеркаванага да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

7.3. Лепшыя крыжаванкі будуць размешчаны ў газеце “Культура” Рэдакцыйна-выдавецкая ўстановы “КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА”.

***Арганізацыйны камітэт***

Дадатак 1

Заяўка
на ўдзел у рэспубліканскім конкурсе літаратурных крыжаванак
"Нельга забыць: вайна ў творах беларускіх пісьменнікаў",
прысвечаным 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх
захопнікаў, сярод дзяцей і моладзі

1. Назва творчай работы ________________________________.
2. Прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара (цалкам).
3. Назва ўстановы адукацыі і клас (група)
4. Узроставая катэгорыя.
5. Кантактны тэлефон, адрас, е-мэйл.
6. Месца пражывання.